**24.** Выберыце правільна напісаныя словы:

*1) кантрасны; 2) праязны; 3) шчаслівы.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**25.** Дадзены сказы:

*1. У гасцінай стаялі канапы, сталы, карціны.*
*2. На факультатыўных занятках дзевяцікласнікі вывучалі літаратуру і будаўніцтва. 3. Лядзяш упаў на ката, спалохаўся і пабег.*

Вызначце, у якіх сказах няправільна ўжыты спалучэнні аднародных членаў.

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**26.** Выберыце з прапанаваных прыклады, у якіх правільна напісаны часціцы: *1) хадзілі то хадзілі, але ягад не знайшлі;*
*2) калі-небудзь сустрэнемся; 3) прачытаў-такі ўвесь твор.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**27.** Дадзены прыклады: *1) краіна; 2) раскажуць; 3) святлее.*

Якое слова можа выконваць ролю галоўнага члена сказа ў назыўным сказе?

**А)** усе словы. **Б)** няма такога слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**28.** Вызначце сказы, у якіх правільна ўтвораны і ўжыты дзеепрыслоўі:

*1. Яна ішла, трымаўшы поўны грыбоў кошык у руках.*
*2. Ён пачаў адвязваць ад багажніка куртку, якую, выязджаючы з дому, захапіў на ўсякі выпадак.*
*3. Елкі, звесіўшы свае галіны, маўкліва слухалі булькат крыніцы.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**29.** У якім сказе з дадзеных на месцы пропуску не паставіце працяжнік?

*1. Нарач _ прыгожае возера. 2. Дуб, дарэчы, _ моцнае дрэва.*
*3. Ноч _ хоць іголкі збірай.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**30.** Хто з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Замёрзла ноччу шпаркая крыніца;*
*Твая пара, зімовая нуда!*

**А)** Мікола Гусоўскі. **Б)** Канстанцін Вераніцын. **В)** Янка Купала.
**Г)** Якуб Колас. **Д)** Максім Багдановіч.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

КОНКУРС

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 5. Тыраж 7200 экз. Мінск. 2026 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2026»

*Чацвер, 12 лютага 2026 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Суніцы, маліны, ажыны – гэта … .

**А)** дрэвы. **Б)** ягады. **В)** рыбы. **Г)** грыбы. **Д)** птушкі.

---

**2.** Аб выдатным спецыялісце ў якім-небудзь рамястве ў народзе гавораць: *“Справа майстра … “.*

Які дзеяслоў прапушчаны ў народным выслоўі?

**А)** працаваць. **Б)** адпачыць. **В)** баіцца. **Г)** заўважыць. **Д)** чакае.

---

**3.** Даволі часта ад хлебаробаў можна пачуць: *“Хлеб – усяму г..л..в..”.*

Вызначце, якія літары неабходна ўставіць на месцы пропускаў у слове.

**А)** а, а, а. **Б)** а, о, а. **В)** о, а, а. **Г)** о. о, а. **Д)** а, о, о.

---

**4.** Колькі словазлучэнняў у сказе?

*Гаспадары восеньскага лесу – дзяцел і сініца.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**5.** Дадзены назвы дрэў: *1) вяз; 2) бяроза; 3) ясень.*

У якім слове ёсць ***[с]***?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

**6.** Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

***Цяжка*** *жыць без сяброў.*

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** займеннікам.
**Г)** прыслоўем. **Д)** лічэбнікам.

---

**7.** Дадзены прыклады: *1) га-йка; 2) нел-ьга; 3) ваў-кі.*

Якія словы няправільна падзелены для пераносу?

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**8.** Які назоўнік прапушчаны ў сказе?

*Юшка – страва са свежай … з прыправамі.*

**А)** морквы. **Б)** бульбы. **В)** капусты. **Г)** рыбы. **Д)** зяляніны.

---

**9.** Дадзены сказ: *Верабей – птушка* ***шкодная*** *ці* ***карысная****?*

Выдзеленыя словы з'яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** паронімамі.
**Г)** амонімамі. **Д)** амографамі.

---

**10.** У якіх словах з прапанаваных свісцячы зычны перад мяккім зычным вымаўляецца цвёрда:

*1) схема; 2) скіт; 3) змена?*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**11.** У беларускім алфавіце літара **ь** (мяккі знак) знаходзіцца перад літарай … .

**А)** ф. **Б)** ц. **В)** ш. **Г)** ы. **Д)** э.

---

**12.** Словы *гэй, га, го* з'яўляюцца … .

**А)** назоўнікамі. **Б)** прыметнікамі. **В)** займеннікамі.
**Г)** прыназоўнікамі. **Д)** выклічнікамі.

---

**13.** Вызначце спосаб утварэння слова *СМІ*.

**А)** суфіксальны. **Б)** словаскладанне. **В)** абрэвіяцыя.
**Г)** прыставачны. **Д)** прыставачна-суфіксальны.

---

**14.** Які займеннік у форме творнага склону мае форму *чым*?

**А)** той. **Б)** хто. **В)** што. **Г)** сябе. **Д)** чые.

---

**15.** Вызначце з прапанаваных прыклады, у якіх выдзеленыя словы маюць пераноснае значэнне:

*1)* ***усмешка*** *раніцы; 2)* ***цёплыя*** *ўспаміны; 3)* ***вір*** *жыцця.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**16.** Дадзены выразы:

*1) ад а да я; 2) пачынаць з азоў; 3) не разумець ні а ні бэ.*

Які сэнс яны маюць:

*а) зусім нічога; б) з самага пачатку, з простага;*
*в) ад пачатку да канца, цалкам?*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-в, 3-а.
**Г)** 1-б, 2-а, 3-в. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

---

**17.** Выберыце словы, у якіх напішаце прыстаўную літару ***в***:

*1) ..аколіца; 2) ..азёры; 3) ..охра.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**18.** Калі скласці лікі 12 і 60, то атрымаецца … .

**А)** семьдзесят два. **Б)** семьдзясят два. **В)** семдзесяць два.
**Г)** семдзесят два. **Д)** семдзясят два.

---

**19.** Вызначце з прапанаваных няправільна напісаныя словы:

*1) цежкаваты; 2) ледовы; 3) белаваты.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**20.** Вызначце від аднасастаўнага сказа.

*З агнём жартаў няма.*

**А)** назыўны сказ. **Б)** пэўна-асабовы сказ. **В)** няпэўна-асабовы сказ.
**Г)** абагульнена-асабовы сказ. **Д)** безасабовы сказ.

---

**21.** Як называецца асадкавая горная парода, якая пры злучэнні з вадой утварае цестападобную масу, ужываецца для ганчарных вырабаў, будаўнічых і скульптурных работ?

**А)** пясок. **Б)** іл. **В)** бетон. **Г)** цэмент. **Д)** гліна.

---

**22.** У якім складаназлучаным сказе з прапанаваных правільна пастаўлены знакі прыпынку?

*1. Сонечны дзень хутка закончыўся, і надышоў вечар.*
*2. Пяць-шэсць кіламетраў – і прывітае нас з вандроўкі родны дом.*
*3. Ластаўкі часта гняздзяцца пад дахамі хат, а вароны стараюцца віць свае гнёзды на дрэвах.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**23.** Дзеяслоў *карыстацца* ў форме абвеснага ладу цяперашняга часу 2-ой асобы множнага ліку запішаце … .

**А)** карыстаяцеся. **Б)** карыстаяцесь. **В)** карыстаецеся.
**Г)** карыстаецесь. **Д)** карыстаіцеся.